Я.В.Бендзік, Ф.К.Галубцоў, Б.Б.Кузьмін перагналі з нямецкага маёнтка ў партызанскі атрад статак кароў. Патрыёты сістэматычна парушалі тэлефоннатэлеграфную сувязь праціўніка на лініях Талачын—Круглае, Круглае—Магілёў. Гітлераўцы ўзмоцнена шукалі падпольшчыкаў. У кастрычніку 1943 г. яны схапілі Я.В.Бендзіка. Фашысты адправілі яго ў барысаўскую турму, затым кінулі ў канцлагер Майданек. Успаміны вязня гэтага лагера А.І.Крывіцкага даюць магчымасць даведацца аб апошніх днях жыцця патрыёта. У фашысцкім засценку ён, ужо цяжка хворы, працягваў барацьбу. Фашысты знішчылі Я.В.Бендзіка ў газавай камеры.

У канцы снежня 1943 г. прыйшла новая бяда. Кіраўнік падпольшчыкаў Л.Н.Ракушаў перадаў праз сувязную партызану-разведчыку Міхаілу Шведаву справаздачу аб дзейнасці арганізацыі. У ноч з 24 на 25 снежня Міхаіл Шведаў трапіў у засаду ў в. Шалкавінне. У перастрэлцы партызан загінуў, а дакументы, што знаходзіліся пры ім, трапілі ў рукі фашыстаў. На наступны дзень былі арыштаваны Л.Н.Ракушаў, Алена і Ніна Болдзісавы, А.І.Дарашкоў, Ф.К.Комлеў, П.М.Дрык і іншыя патрыёты. З выключнай мужнасцю трымаў сябе на допыце Л.Н.Ракушаў. Знявечаны, змучаны працяглымі нечалавечымі катаваннямі, ён не паказваў сваіх пакут і памёр як герой. За заслугі ў арганізацыі барацьбы ў тыле фашысцкіх акупантаў, мужнасць і гераізм Л.Н.Ракушаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Гітлераўцы па-зверску катавалі і



П.М.Дрык.



А.Г.Крылоў.

іншых падпольшчыкаў. Пасля перанесеных пакут фашысты расстралялі А.Б. і Н.Б.Болдзісавых, В.С.Гуркова, А.І.Дарашкова, П.М.Дрык, А.М.Зіньковіча, Ф.К.Комлева, Б.Б.Кузьміна, Н.П.Лазарчук, М.А.Ракушава, В.П.Цішурава.

Пасля арышту і гібелі асноўнага складу падпольшчыкаў Круглянская падпольная арганізацыя спыніла сваю дзейнасць. У рады беларускіх партызан пайшлі змагацца былыя падпольшчыкі К.Д.Баранава, Е.Ф.Галубцова, П.Ф.Галубцова, В.Ц.Крывялёў, А.Г.Крылоў, В.В.Палякоў. Гаспадыня галоўнай канспіратыўнай кватэры А.С.Цітова працягвала перадаваць партызанам брыгады «Чэкіст» звесткі аб руху часцей праціўніка і іх колькасці. Патрыётка ўзяла на выхаванне двухгадовую яўрэйскую дзяўчынку, а калі пачаліся арышты, пераправіла яе ў партызанскі атрад. Менш за месяц не дажыла Аляксандра Сяргееўна да прыходу Чырвонай Арміі. 10 чэрвеня 1944 г. яна была арыштавана і па-зверску закатавана фашыстамі.

## ПАРТЫЗАНСКАЯ ВАЙНА

### З успамінаў С.Г.Жуніна

Сяргей Георгіевіч Жунін — Герой Савецкага Саюза (15.8.1944). Нарадзіўся 18.8.1906 г. ў в. Мядзведзіцкае Кімрскага раёна Калінінскай вобласці. З сялян. У Чырвонай Арміі з 1928 г. У пачатку вайны на Заходнім фронце — памочнік камандзіра танкавага палка, удзельнік абароны Беластока, Гродна, Ваўкавыска, Слоніма. З ліпеня 1941 г. партызан, камандзір групы, з красавіка



С.Г.Жунін.

1942 г. камандзір атрада «Сяргея» (пазней 36-ы атрад). У кастрычніку 1943 г. камандзір Круглянскай ваенна-апаратыўнай групы. З снежня 1943 г. палкоўнік Жунін — камандзір 8-й Круглянскай брыгады. У 1944—50 гг. на савецкай рабоце ў Брэсце і Мінску. Памёр 27.1.1977 г. Імем С.Г.Жуніна названа вуліца ў г.п. Круглае, яго бюст устаноўлены ў парку ў г.п. Круглае.

## МАРТЬЯНОВИЧСКАЯ ОПЕРАЦИЯ

Находясь в Кличевских лесах, мы не теряли связи с Круглянским и Крупским районами. Нас тянули к себе места, ставшие родными и близкими. В каждой деревне мы имели друзей. Оттуда разведчики доносили, что фашисты, укрепив свои многочисленные гарнизоны, распространяют слухи о том, что все партизаны уничтожены или взяты в плен.

Мы решили делом опровергнуть эти слухи.

За две недели пребывания в Кличевской зоне бригада окрепла. Прежде всего надо было разгромить мартьяновичский гарнизон. Он был очень нужен противнику. В Мартьяновичах пересекались почти все основные пути, ведущие из Белыничского и Круглянского районов на станцию Славное. Эту деревню фашисты использовали для наблюдения за передвижениями партизан. Разгром мартьяновичского гарнизона, кроме всего прочего, открывал нам путь в глубь Круглянского и Толочинского районов.

Мы остановились в пяти километрах от гарнизона. Сюда прибыли и ранее оставшиеся на месте три отряда. Командиры получили приказ и начали сосредоточивать силы на исходных рубежах.

Северный ветер бросал в нас снежные хлопья, обжигал лица. Была глубокая ночь. В деревне тихо.

Ровно в 2 часа взвилась красная ракета. Партизаны без шума вошли в Мартьяновичи. По казармам ударили наши минометы и пулеметы. Из домов выскакивали перепуганные враги. Одни бросались наутек по глубокому снегу, другие мертвыми падали на месте.

Роту партизан под командованием Михаила Кулаковского мы оставили в засаде со стороны Павлович. Две роты 36-го отряда под командованием Кудрявцева и Редина повели наступление на второй мартьяновичский поселок в направлении вражеской конюшни. 30, 28 и 12-й отряды наступали с опушки готовского леса вдоль Мартьянович до центра гарнизона.

Петров и Никитченко приказали усилить огонь. На лошадях многие гитлеровцы бросились к Павловичам. Но здесь их встретила рота Кулаковского, ожидавшая в засаде. Сразу же было уничтожено 20 вражеских всадников. Взято несколько повозок с четырьмя ручными и одним станковым пулеметом, противотанковое ружье, а также 10 автоматов.

Часть фашистов повернула в сторону Углян. Но на кладбище их ожидали Семен Доманьков, Геннадий Кудин, Макар Ирхин, Федор Кандыба, Гребенников и другие. Они взяли около 60 лошадей с седлами и много оружия. Аким Айсаев, Иван Виноградов, Станислав Новицкий, Петр Семенов, Иван Лесун, Владимир Конопелько, Василий Лесун и Георгий Ковриго захватили 19 лошадей с седлами.

Гарнизон был полностью разбит. С богатыми трофеями и продовольствием мы возвратились на свою базу. В этой операции мы взяли около 100 лошадей с седлами, попонами, переметными сумками, двенадцать станковых и ручных пулеме-

тов, более сотни винтовок, два миномета и большое количество патронов. Бригада потеряла Александра Черника, Ивана Зайцева, Алексея Сергеева. Хоронили их со всеми почестями.

Партизаны убедились, что и зимой можно эффективно вести борьбу против фашистских захватчиков.

## ПАВЛОВИЧСКИЙ БОЙ

Вечером 20 августа Николай Латушкин пробрался в Павловичи и установил, что туда прибыло еще 80 гитлеровцев и что началось сооружение дзотов и других укрытий. На вооружении у них имеются пушка, миномет, станковый пулемет и 6 ручных.

— Не дадим окопаться врагу! — предложил Андрей Никитченко.

Его поддержали и другие командиры отрядов. Сил у нас достаточно, боеприпасы есть.

Утром 21 августа мы подошли вплотную к деревне Павловичи. Руководство операцией возложено на Андрея Степановича Никитченко. В ней участвуют 12, 28 и 36-й отряды.

Видно, как гитлеровцы роют траншею. По команде партизаны открыли огонь. Враги явно не ожидали такого, ведь обычно мы нападали на гарнизоны ночью. Внезапность обеспечила нам успех. Петр Лаппо и Геннадий Грозберг по кювету подкрадываются к вражескому пулемету. Остается уже немного. Павел Булыгин подхватил свой пулемет и хотел перебежать улицу, чтобы прикрыть товарищей. Но упал. Петр Лаппо подполз к раненому и утащил его вместе с пулеметом в безопасное место. Пули свистят над головой. Грозберг бросил гранату, но она не достигла цели. Вперед рванулся Александр Зезюлин и тут же мертвым упал на землю. Василий Бучко тяжело ранен. К нему подоспел Леонид Рудниченко, но было поздно. Так и лежал Василий, прижав к себе противотанковую гранату. Леонид тихонько взял ее и изо всех сил бросил. Вражеский пулемет утих. Григорий Масленников своими пулеметными очередями отрезал фашистам путь в крайний дзот.

К самой амбразуре дзота подскочил Павел Воробьев. Все удивились, когда в его руках увидели обыкновенный молот. Партизан размахнулся и ударил по стволу вражеского пулемета. Огонь прекратился. На смельчака набросилось несколько фашистов. Но Воробьев, словно сказочный богатырь, размахивал тяжелым молотом. Вдруг он круто повернулся и начал оседать на землю. Тяжело ранен в руку Николай Латушкин.

Дан сигнал к отходу. Петр Лаппо, Геннадий Грозберг, Петр Кругликов, Сергей Мансуров, Андрей Новицкий, Иван Деревяшкин прикрывают отходивших партизан. Тело Воробьева не удалось унести, так как со второго укрытия враг продолжал вести прицельный огонь, да и в Павловичи спешили гитлеровцы из Круглого и Шепелевич.

Повозки с ранеными партизанами двинулись в направлении деревни Падор, возле которой был наш аэродром. Сопровождать раненых поручено врачу Никите Чигирю и фельдшеру Владимиру Максимовичу Протасевичу. Они внимательно наблюдают за состоянием каждого. Особенно тяжело Николаю Латушкину. Разрывная пуля угодила ему выше локтевого сустава и перебила почти все кровеносные сосуды руки. Наложением тугой повязки не удалось остановить кровотечение. Протасевич вынужден на ходу наложить жгут. Превозмогая боль, Николай смотрит на фельдшера, как бы спрашивая о своей дальнейшей судьбе. Что может ответить Владимир? Он хорошо знает, что только своевременная ампутация руки может спасти жизнь боевого парня.

Петр Кругликов, Константин Головков, Владимир Иваньков и Леонид Рудниченко несут тело Василия Прокофьевича Бучко. Это был смелый разведчик и подрывник. На его счету три пущенных под откос эшелона. Многое сделал Бучко по разложению вражеских гарнизонов, за что в конце 1942 года награжден орденом Красной Звезды.

22 августа гитлеровцы хоронили Павла Воробьева. Немецкий офицер построил солдат и произнес речь над телом партизана:

«Только русские люди могут так драться со своими врагами. Если бы каждый пятый наш солдат имел столько мужества, как этот герой, то Германия не проиграла бы войны никогда. Учитесь у этого русского парня, поклонитесь ему...»

Враги отдали воинские почести Павлу Воробьеву. Наши разведчики наблюдали с опушки леса и никак не могли понять, что творят недобитые гитлеровцы.

Потом перебежавший к нам полицейский рассказал, о чем говорил немецкий офицер во время похорон Воробьева.

Полностью разбить гарнизон не удалось, но врагу был нанесен большой ущерб. Гитлеровцы вынуждены были оставить Павловичи.

*Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Жунин С.Г. От Днепра до Буга. Мн., 1974. С. 111—112, 177—179.*

## ЗАПІСКІ КАМБРЫГА

**З успамінаў Г.А.Кірпіча, былога камандзіра партызанскай брыгады «Чэкіст», якая дзейнічала на тэрыторыі Круглянскага раёна**

### ЗАБОЙСТВА КАМЕНДАНТА КРУГЛЯНСКАГА ГАРНІЗОНА

Людзі пастаянна прыбывалі ў атрад групамі і паасобку, са зброяй і без яе, і цераз месяц атрад «Чэкіст» налічваў ужо 200 чалавек. Былі ў ім роты, узводы і аддзяленні. Мноства задач стаяла перад намі, але адной з першых быў разгром нямецка-паліцэйскіх участкаў і гарнізонаў. Вельмі ўжо спакойна адчувалі яны сябе на нашай зямлі. Нямала злачынстваў было на рахунку каменданта Круглянскага гарнізона, і калі мы даведаліся, што ён выязджае са сваёй перакладчыцай у вёску Дубрава, вырашылі знішчыць яго. Выканаць гэту аперацыю ўзяўся Рыгор Іваноў. Суткі прасядзела яго група ў снегавой засадзе. Нарэшце паказалася легкавая аўтамашына. З першага ружэйна-кулямётнага залпа шафёр і камендант былі забіты, машына завалілася ў кювет. Камендант не паспеў нават схапіцца за кабуру пісталета, у шафёра быў аўтамат. Групе дасталіся трафеі.

***

### ВЫЗВАЛЕННЕ АРЫШТАВАНЫХ

... Наш сувязны Віктар Часцякоў паведаміў аднойчы пра арышт патрыётаў з вёскі Літоўск Машы Венядзіктавай, Рыгора Прохарава, Веры Даніленка, Зінаіды і Валянціны Прохаравых, Лідзіі Ганчаровай. Мы сталі абмяркоўваць, як вызваліць іх з бяды. Вырашылі, што двое партызан адправяцца да сваякоў арыштаваных, а тыя, узяўшы больш сала, яек, самагонкі, пойдуць у Круглае і пагавораць з вартаўнікамі. «Многія з іх — жыхары навакольных вёсак, значыць, і дзяўчат ведаюць, — сказаў я. — Пажадана таксама сустрэцца і паспрабаваць улагодзіць Вярціхоўскага».

Аднак на наступны дзень сваякі вярнуліся ні з чым. Да арыштаваных не дапускаюць, перадачы не прынялі. Трымаюць у розных камерах, катуюць. Вярціхоўскі і Сямён Дзякаў адмовіліся размаўляць з жанчынамі. Але мы не адступілі. Вырашылі павесці атаку толькі на Вярціхоўскага і Дзякава і папярэдзіць, што калі што-небудзь здарыцца з нашымі таварышамі, то ім абодвум не здабраваць. Зноў сабралі прадукты, больш тысячы рублёў грошай, і старэйшая сястра Машы Венядзіктавай Тоня разам з цёткай Еўдакіяй зноў адправіліся ў Круглае. Не адразу была дасягнута згода з Вярціхоўскім і Дзякавым. Нарэшце яны здаліся. Пры кожнай сустрэчы з нямецкім камендантам пераконвалі яго,